# «КАЛІ ПЕСНЯ ЖЫВЕ БЕЛАРУСА, БУДЗЕ ЖЫЦЬ БЕЛАРУСКІ НАРОД!»

У паэтычных радках верша беларускага класіка Міхася Чарота заключана ўсё: душа нашых продкаў, назапашаны пакаленнямі гістарычны і жыццёвы вопыт, патрыятычныя пачуцці, павага да традыцый.

Народна-песенная спадчына заўжды ўяўляла сабой важную частку духоўнай культуры беларускага народа. У ёй у канцэнтраваным выглядзе захоўваюцца маральныя прынцыпы і каштоўнасці грамадства, багацейшы шматвяковы культурны вопыт, веданне якога адыгрывае выключную ролю ў ідэалагічным, патрыятычным, эстэтычным выхаванні беларусаў, садзейнічае фарміраванню гуманістычных ідэалаў, актыўнай грамадзянскай пазіцыі жыхароў краіны, развіццю адказнасці і нацыянальнай самасвядомасці. Беларускія народныя песні захоўваюць і перадаюць эмацыянальны складнік жыцця нашых продкаў. Таму вельмі важна ведаць, вучыць і спяваць свае родныя песні.

Аднак, нягледзячы на вялікую і разнастайную спеўную спадчыну, нацыянальны песенны фальклор сёння не надта вядомы і папулярны сярод простых звычайных беларусаў. Гэта, калі можна так казаць, «тэрыторыя» вузкага кола спецыялістаў (музыказнаўцаў-фалькларыстаў, этнографаў, этнафоназнаўцаў), якія збіраюць і markdownрознабакова даследуюць вакальныя ўзоры, што захаваліся яшчэ на нашых землях, а таксама музыкантаў (кампазітараў, спевакоў, харавых дырыжораў), якія выкарыстоўваюць назапашаныя фальклорныя матэрыялы для стварэння новых музычных твораў у розных жанрах ці непасрэднага сцэнічнага выканання народных песень на канцэртах.

Галоўная годнасць зборніка ў тым, што ў ім сабраны эксклюзіўны вакальны матэрыял. Гэтыя песні былі запісаны, расшыфраваны і распеты заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Валянцінай Пархоменка, аўдыёзапісы* якіх яна падаравала складальніку гэтага выдання заслужанаму артысту Рэспублікі Беларусь, салісту Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, дацэнту кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» Васілю Яфімавічу Браіму.

Сярод песень зборніка можна знайсці ўзоры розных ступеней складанасці. Таму гэтыя творы будуць карысны і спевакам-пачаткоўцам, і тым, хто ў навуцы спеву мае

* Аўдыёзапісы песень размешчаны на сайце Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур nationalcultures.by.

больш прафесійны досвід. Выкарыстоўваць дадзены музычны матэрыял можна як для сольнага спеву, так і для ансамблевага (дуэтнага) выканання. Нягледзячы на тое, што ўсе песні ў зборніку пададзены для спеву a cappella, яны могуць выконвацца і з інструментальным суправаджэннем. Акрамя таго, звяртаем увагу ўсіх карыстальнікаў выдання на тое, што літаратурныя тэксты твораў пададзены ў арыгінальнай фанэтыцы і могуць змяшчаць дыялектныя рэгіянальныя асаблівасці. Таксама тэкставая і музычная рытміка ў куплетах або страфах песень могуць не супадаць, таму ў выканаўцаў ёсць магчымасць для адноснай вакальнай і рытмічнай імправізацыі.

Выданне перш за ўсё рэкамендуецца аматарскім фальклорным гуртам, ансамблям беларускай народнай песні і салістам-вакалістам з народнай манерай спеву. Матэрыялы будуць карыснымі і для педагагічнай працы з навучэнцамі музычных каледжаў, каледжаў культуры і мастацтваў, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў творчага кірунку. Спадзяемся, што ўсе прыхільнікі беларускай народнай песні змогуць па вартасці ацаніць выданне, а музычныя творы, што надрукаваны ў ім, узбагацяць рэпертуар беларускіх выканаўцаў народных песень, тым самым унёсшы свой неацэнны ўклад у справу папулярызацыі найлепшых узораў беларускага песеннага фальклору.

*А. Ю. Валодчанка,*
*старшы выкладчык кафедры*
*народна-песеннай творчасці і фальклору*
*УА «БДУКМ», магістр мастацтваў*